**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ДУДО ПЁТР ДЗМІТРЫЕВІЧ

**ЖУРНАЛІСТ, ПРАЗАІК**

**4 ВЕРАСНЯ 1911 – 23 ЛЮТАГА 1958**

**ФОНД № 297**

**ВОПІС № 1**

**1940 – 1957**

**МІНСК 2016**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 297**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ П.Д. ДУДО, ПІСЬМЫ | 1-7 | |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ П.Д. ДУДО | 8-12 | |
| 3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 13-20 | |
| 4. | СПІС МУЗЕЙНЫХ ЭКСПАНАТАЎ | | |

# Прадмова

**Дудо Пётр Дзмітрыевіч** нарадзіўся 4 верасня 1911 г. у вёсцы Забалоцце Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер Лепельскі раён Віцебскай вобласці) у сялянскай сям'і. З 1935 г. служыў у Чырвонай Арміі. У 1937-1940 гг. вучыўся ў Беларускім дзяржаўным інстытутце журналістыкі імя С.М. Кірава (КІЖ) у Мінску. У 1940-1941 гг. працаваў намеснікам рэдактара газеты "Вольная праца" ў Беластоку. З чэрвеня 1941 г. у Чырвонай Арміі быў палітработнікам, з [ліпеня] 1943 г. пачаў працаваць літаратурным супрацоўнікам у чырвонаармейскай газеце "Вперёд" 19 Чырвонасцяжнага Перакопскага танкавага корпуса. Збіраючы матэрыял для газеты, часта прымаў удзел у контратаках супраць фашыстаў. За гады вайны ваяваў на Бранскім, Цэнтральным, 4-м Украінскім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. У [1945]-1949 гг. працаваў карэспандэнтам-арганізатарам газеты "Советский воин", З 1949 г. да 1957 г. быў карэспандэнтам-арганізатарам газеты "Во славу Родины" (Мінск). У званні падпалкоўніка па стану здароўя звольніўся ў запас. Быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі (1943, 194?), двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені (1943, 1944) і медалямі.

П.Д. Дудо ў друку пачаў выступаць з артыкуламі ("Вывучаем матэрыял з'ездаў…") з 1934 г., а з 1935 г. – з апавяданнямі ("Не даехалі", "Насосы", "Прафесар" і інш.), рэцэнзіямі на фільмы. У час вайны пісаў нарысы і артыкулы з армейскага жыцця для газеты "Вперёд". Удзел П.Д. Дудо ў бітве на Курскай дузе даў яму матэрыял для будучага твора – аповесці "Першы салют" (першая назва "Полымя"), быў надрукаваны ў часопісе "Полымя" ў 1953 г. Напісаў сатырычную камедыю "Чортаў тузін". Член СП БССР з 1958 г.

П.Д. Дудо памёр 23 лютага 1958 г. Пахаваны на Вайсковых могілках г.Мінска.

Дакументы асабістага паходжання П.Д. Дудо паступілі ў БДАМЛМ ад Наталлі Міхайлаўны Дудо (удавы) у 1985 г. Ад яе вядома, што асабістыя дакументы былі знішчаны пры рамонце кватэры. У 2016 г. дакументы П.Д. Дудо прайшлі навуковае апісанне. Быў складзены вопіс № 1 у кольскасці 20 спраў (75 дакументаў) за 1940-1957 гг.

Вопіс №1 склалі тры невялікія раздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па храналогіі. У раздзеле "Рукапісы" змешчаны нарысы і артыкулы, якія друкаваліся ў чырвонаармейскай газеце "Вперёд" – "Бессмертный подвиг девяти разведчиков", "Большевики-танкисты", "Братья Ухины", "Герой Советского Союза Василий Ершов" і інш. за 1943-1945 гг. Пасля спраў з нарысамі П.Д. Дудо змешчаны асобныя нумары газеты "Вперёд" з яго паметамі, у якіх, магчыма, ёсць і яго матэрыялы ці матэрыялы, падрыхтаваныя пад яго кіраўніцтвам ваенкораўскім актывам. У раздзел біяграфічных дакументаў уключана справа з інтэрнэт-сайта "Подвиг народа" (http://podvignaroda.mil.ru/), дзе былі знойдзены яго дакументы аб узнагароджаннях П.Д. Дудо, якія даюць дадатковыя, раней невядомыя,

штрыхі да яго біяграфіі. Большая частка выяўленчых дакументаў – гэта фатаграфіі ваеннага часу.

Прадмову склала
заг. аддзела В.Я. Данекіна

11.08.2016

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ П.Д. ДУДО, ПІСЬМЫ** | | | | |
| 1 | "Люби и защищай свою Родину", "Танкист Баюков", "Убей зверя", "Успешно идут на запад наши танки". Нарысы і артыкулы.<br>Чырвонаармейская газета "Вперёд" за 1943 г. № 157, 175, 183, 189, 215 | | 6 | 5 | |
| 2 | "Бессмертный подвиг девяти разведчиков", "Братья Ухины", "Герой Советского Союза Василий Ершов", "Офицер Сергей Ваев", "Через Сиваш". Нарысы.<br>Чырвонаармейская газета "Вперёд" за 1944 г. № 51, 63, 75, 77,176 | | 5 | 5 | |
| 3 | "Большевики-танкисты", "Командир автоматчиков", "Мститель", "Партсобрание после боя". Нарысы і артыкул.<br>Чырвонаармейская газета "Вперёд" за 1945 г. № 4, 7, 78 (2), 100 | | 5 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Вперёд". Чырвонаармейская газета за 1943 г. № 152, 162, 185, 190, 195, 199, 200; за 1944 г. № 132 з пометамі П.Д. Дудо | | 10 | 8 | |
| 5 | "Вперёд". Чырвонаармейская газета за 1945 г. № 1, 8, 9, 11, 24 (2), 26, 31, 40, 46, 49, 51, 57, 66 (2), 73 з пометамі П.Д. Дудо | | 16 | 16 | |
| | * * * | | | | |
| 6 | Пісьмы П.Д. Дудо да Н.М. Дудо (жонкі) | 1948, 1949 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | Пісьмо Дзяржвыдавецтва БССР П.Д. Дудо пра выданне яго кнігі "Першы салют" | 1954 | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ П.Д. ДУДО** | | | | |
| 8 | Дыплом Беларускага дзяржаўнага інстытута журналістыкі імя С.М. Кірава аб заканчэнні на імя П.Д. Дудо | 1940 | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | Ордэнская кніжка П.Д. Дудо | 1943-1946 | 5 | 1 | |
| 10 | Дакументы П.Д. Дудо аб узнагароджаннях (загады, узнагародныя лісты, апісанне подзвігаў). Копіі з электроннага інтэрнэт-сайта "Подвиг народа". 2016 | 1943-1944 | 11 | 9 | |
| 11 | Дакументы П.Д. Дудо аб звальненні ў запас (загад камандуючага БВА С.М. Цімашэнкі, пісьмо Мінскага абласнога ваеннага камісарыята аб назначэнні пенсіі Міністэрства абароны СССР) | 1957 | 2 | 2 | |
| 12 | Адрас і блакнот з пажаданнямі П.Д. Дудо ад супрацоўнікаў рэдакцыі газеты "Во славу Родины" | 1957 | 25 | 2 | |
| | **3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 13 | Фотапартрэт і фатаграфіі П.Д. Дудо, індывідуальныя. Адна - з дароўным надпісам сыну Міхаілу і Н.М. Дудо (жонцы) ад 17.12.1942 | 1941 | 3 | 3 | |
| 14 | Фатаграфіі П.Д. Дудо, індывідуальныя. Л.3 - надпіс жонцы і сыну л.4. фатаграфія-пасведчанне асобы карэспандэнта аддзела прапаганды рэдакцыі газеты "Советский воин" | [1943-1946] | 5 | 5 | |
| 15 | Фатаграфія П.Д. Дудо с сынам Сяргеем | [1954-1955] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Фатаграфія П.Д. Дудо ў групе з аднакурснікамі-студэнтамі Беларускага дзяржаўнага інстытута журналістыкі імя С.М. Кірава | [1940] | 1 | 1 | |
| 17 | Фатаграфіі П.Д. Дудо з супрацоўнікамі рэдакцыі чырвонаармейскай газеты "Вперёд" | [1943]-1945 | 6 | 6 | |
| 18 | Фатаграфія П.Д. Дудо з ваеннымі ў Рызе пасля пераправы праз пантонны мост на Заходняй Дзвіне | 1944 | 1 | 1 | |
| 19 | Фатаграфіі П.Д. Дудо з супрацоўнікамі рэдакцыі газеты "Во славу Родины" ў Слуцку, у Слоніме | 1952, [1956] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | Фатаграфіі салдат артылерыйскага разліку капітана П.І. Палякова (Крым) і салдат у Прыазоўскім | 1943, [1944] | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 20 (дваццаць)

спраў з № 1 па № 20 , 78 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

________________________

Дакументы прынялі:

________________________

________________________

"_____"_____________20____ г.